# Інтэлектуальная культура Беларусі эпохі Рэнесансу і барока

УДК 821.161.3.091 «15/16»



**Іван САВЕРЧАНКА,**
**доктар філалагічных навук,**
**прафесар**

Іван САВЕРЧАНКА. Інтэлектуальная культура Беларусі эпохі Рэнесансу і барока. Асветлена багатая інтэлектуальная культура Беларусі XVI–XVII стагоддзяў, выяўлены галоўныя тэмы і праблемы, што ўздымаліся ў палемічных і публіцыстычных творах. Паказаны ключавыя аспекты дыскусій і лініі ідэйнай барацьбы паміж пісьменнікамі-інтэлектуаламі, прадстаўнікамі розных філасофска-рэлігійных плыняў. Раскрываецца паэтыка і семіётыка старабеларускай публіцыстычнай літаратуры, выяўлены яе асноўныя мастацка-эстэтычныя і жанравыя формы. Вызначаны семантычныя дамінанты і структурна-кампазіцыйныя кампаненты публіцыстычных твораў, акрэслены прынцыпы і ўстойлівыя заканамернасці ўнутранай арганізацыі публіцыстычнага дыскурсу.
Ключавыя словы: Рэнесанс, барока, культура, публіцыстыка, паэтыка, жанры, палеміка.

Ivan SAVERCHANKA. Belarus' intellectual culture in the Renaissance and Baroque periods. The article explores the rich intellectual culture of Belarus in the Renaissance and Baroque periods, the themes and problems that dominated polemical and journalistic works, key themes for debate and ideological struggle between writers-intellectuals, representatives of various philosophical and religious movements. The article delves into poetics and semiotics of the old Belarusian publicist literature, examines its main artistic, aesthetic and genre forms. The author identifies semantic dominants and structural and compositional components of journalistic works, the principles and regularities of the internal structure of journalistic discourse.
Keywords: Renaissance, Baroque, culture, journalism, poetics, genres, controversy.

## Культ ведаў і навукі

На працягу стагоддзяў беларусы стварылі багатую інтэлектуальную культуру, якая забяспечвала гарманічнае існаванне грамадства і паспяховае развіццё краіны. Найбольш значныя здабыткі атрыманы ў эпоху Рэнесансу і барока, пасля з´яўлення друкаванай кнігі і ўсталявання культу кніжных ведаў і навукі.

Да ліку буйных інтэлектуалаў мінулага часу належаць выдатныя асобы нацыянальнай гісторыі і культуры: Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Лявонцій Карповіч, Стафан і Лаўрэнцій Зізаніі, Мялецій Смятрыцкі, Крыштаф Філалет, Іпацій Пацей, Іосіф Вельямін-Руцкі, Андрэй Мужылоўскі, Сільвестр Косаў, Афанасій Філіповіч. Менавіта яны стварылі ўнікальную інтэлектуальную культуру Беларусі, прадстаўленую яркімі творамі нацыянальнай публіцыстыкі *[1]*.

Агульная колькасць арыгінальных помнікаў публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў перавышае 700 тэкставых адзінак *[2]*. Феномен узнікнення аграмаднай у колькасных і якасных адносінах мастацкай публіцыстычнай спадчыны Беларусі гэтых двух стагоддзяў тлумачыцца той акалічнасцю, што продкі беларусаў для пераадолення, «зняцця»

### ПРА АЎТАРА

САВЕРЧАНКА Іван Васільевіч.

Нарадзіўся ў 1962 годзе ў в. Маліноўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А. Куляшова (1983), аспірантуру Інстытута літаратуры АН БССР (1987).

З 1987 года працуе ў Інстытуце літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. З 2016 года – дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі.

Доктар філалагічных навук (2001), прафесар (2013).

Аўтар звыш 350 навуковых прац па філалогіі, гісторыі і філасофіі, сярод якіх 12 манаграфій. Напісаў пяць кніг гістарычнай прозы, падрыхтаваў шэсць тамоў літаратурных помнікаў беларускага пісьменства.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя і тэорыя літаратуры, гісторыя Беларусі, сучасныя праблемы ўлады і дзяржаўнасці, міжнародныя адносіны.

натуральных супярэчнасцей і непазбежных канфліктаў – сацыяльных, этнічных, канфесійных, міжнародных – абіралі не сілавыя і збройныя метады, не шлях фізічнага знішчэння ворага (апанента), а пераносілі барацьбу ў інтэлектуальную сферу, надавалі ёй формы свабоднай, адкрытай дыскусіі на старонках друкаваных і рукапісных твораў, а таксама нязмушанага абмену думкамі на соймах і сойміках, на саборах і з´ездах, ва ўніверсітэтах і на царкоўных кафедрах.

Публіцыстычная літаратура Беларусі XVI–XVII стагоддзяў развівалася ў рэчышчы дзвюх плыняў – свецкай і рэлігійнай, аднак мяжа між імі не заўсёды выразная. У многіх творах натуральна спалучаліся свецкія і рэлігійныя тэмы, сюжэты, агульначалавечыя і адметныя хрысціянскія матывы. Да таго ж беларуская публіцыстычная літаратура гэтага перыяду стваралася не толькі свецкімі асобамі – урадоўцамі, ваярамі, князямі, шляхтай, але і прадстаўнікамі духоўнага стану – святарамі, манахамі і найвышэйшымі іерархамі *[3]*.

Прысутнасць на духоўна-культурным ландшафце Беларусі асноўных сусветных рэлігій спрычынілася да таго, што старабеларускае публіцыстычнае пісьменства мела заўважную канфесійна-рэлігійную прадвызначанасць і скіраванасць. Зважаючы на крытэрый канфесійнай прыналежнасці, увесь корпус старабеларускіх публіцыстычных твораў тыпалагічна распадаецца на чатыры асноўныя складовыя і прадстаўлены праваслаўнай, каталіцкай, пратэстанцкай і ўніяцкай літаратурамі.



**Праваслаўны служэбнік, выдадзены ў друкарні Л. Мамоніча. Першая палова XVII стагоддзя**

Праваслаўная плынь старабеларускага прыгожага пісьменства знітавана з выбітнымі імёнамі Л. Мамоніча, П. Мсціслаўца, С. і Л. Зізаніяў, Л. Карповіча, А. Мужылоўскага, А. Філіповіча, І. Труцэвіча, С. Косава, І. Галятоўскага. Вельмі багаты рэестр ананімных помнікаў праваслаўнага палемічнага пісьменства: «Пра Тройцу», «Сказ супраць Уніі», «Пытанні і адказы праваслаўнаму з папежнікам».

Ва ўлонні каталіцкай культуры Беларусі сфарміраваліся і расквітнелі творчыя індывідуальнасці А.-Р. Мялешкі, Л. Сапегі. Прызнаныя карыфеі мастацкага пяра – С. Будны, М. Радзівіл Чорны, П. Гоняд, А. Валян, В. Цяпінскі, К. Філалет, В. Салінарыус – ствальнікі пратэстанцкай літаратуры Беларусі.

Напрыканцы XVI стагоддзя, з прыняццем Брэсцкай уніі 1596 года, імкліва расквітнела ўніяцкая публіцыстычная літаратура, да якой належалі надзвычай таленавітыя пісьменнікі-палемісты: І. Пацей, І. Вельямін-Руцкі, Л. Крэўза, А. Сялява, І. Марахоўскі, І. Кунцэвіч, К. Транквіліён-Стаўравецкі.

У плане канфесійнай прыналежнасці творчасць паасобных пісьменнікаў Беларусі XVI–XVII стагоддзяў неаднародная. Так, у выніку збегу жыццёвых абставін, эвалюцыі ідэйна-рэлігійных поглядаў і асабістага творчага лёсу адна частка творчай спадчыны бліскучага майстра слова Мялеція Сматрыцкага знітавана з праваслаўем, а другая – з уніяцтвам. Творчасць Касіяна Саковіча гэтаксама дзеліцца на два перыяды – праваслаўны і каталіцкі. Творчы лёс М. Сматрыцкага і К. Саковіча – паказчык рэлігійнай цярплівасці ў Беларускай дзяржаве, і галоўнае – прызнанне за пісьменнікам, нягледзячы на ўсе акалічнасці, неад´емнага права на творчую і светапоглядную эвалюцыю, права на пошук і эксперымент.

Дзеля дасягнення творчых мэт беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы абіралі і выкарыстоўвалі жанравыя формы, найбольш прыдатныя для кожнага канкрэтнага выпадку. Публіцыстычная літаратура Беларусі XVI–XVII стагоддзяў (рэлігійная і свецкая) уключала 12 асноўных жанравых комплексаў, сярод якіх: палемічныя трактаты («адказы», «аспрэчанні», «абароны», «апалогіі», «пярэчанні», «пасланні», «эпісталы» і «водпісы»); аналітычныя творы («навукі», «вучэнні», «фундаменты», «гутаркі», «размовы», «дыялогі», «разважанні», «філасофіі», «вызнанні», «сімвалы», «тэзісы» і «артыкулы»); экзэгетычныя творы («тлумачэнні», «прыпіскі», «надпісы» да раздзелаў біблейных кніг); урачыстыя словы і казанні; катэхізісы, дыдаскалі і павучанні; сінкрэтычна-эпічныя творы («апісанні», «рэляцыі», «адпіскі» «сінопсісы»); казанні на пахаваннях; адозвы, перасцярогі, звароты і заявы; пратэстацыі і суплікі; прамовы і словы на соймах, трыбуналах, саборах, дыпламатычных раундах; прадмовы, пасляслоўі і прысвячэнні; сатырычныя лісты, псеўдаказанні, псеўдапрамовы і псеўдаграматы. До-

казна пацверджана, што шматстайнасць жанравых форм – паказчык шырокага дыяпазону эстэтычных густаў майстроў публіцыстычнага слова, адзнака іх высокай мастацкай культуры.

Родавая і відава-жанравая прырода публіцыстычнага дыскурсу гэтага перыяду сфарміравалася пад уплывам, у першую чаргу, хрысціянскай кніжнай традыцыі, прычым як заходнерымскіх, раманскіх, так і грэка-візантыйскіх аўтараў. Беларускія пісьменнікі-публіцысты пры выбары форм арыентаваліся на старажытныя ўзоры, што сталася вынікам эстэтычнай формулы – чым больш форма старажытная, тым яна бліжэй да дасканаласці, тым вышэй яе эстэтычныя вартасці. Арыентацыя на старажытнасць выявілася на ўзроўні будовы (вылучэнні тыповых раздзелаў, іх назваў і топікі), унутранай мастацка-кампазіцыйнай структуры і нават у назвах канкрэтных твораў, у якіх пераважала грэцкая або рымская моўная аснова («антырызіс», «антыдотум», «апокрысіс», «антыграфі», «апалогія», «верыфікацыя», «сінопсіс»).




Сымон Будны, беларускі асветнік, публіцыст, кнігавыдавец XVI стагоддзя




«Катэхізіс» Сымона Буднага, выдадзены ім у Нясвіжы ў 1562 годзе

Беларускія пісьменнікі-публіцысты XVI–XVII стагоддзяў істотна пашырылі гарызонты традыцыйных жанраў, выявілі праз іх уласную творчую індывідуальнасць, узбагацілі на ўсіх узроўнях, абнавілі іх структурна, у канкрэтна-гістарычных умовах літаратурнага працэсу надалі адметную канцэптуальна-функцыянальную парадыгму. Публіцыстычнае пісьменства Беларусі развівалася на чатырох літаратурных мовах – старабеларускай, царкоўнаславянскай, лацінскай і польскай.

Старабеларуская публіцыстычная літаратура азначанага перыяду ўзнікла і эвалюцыянавала ў найскладанейшых умовах. Найбольш значныя ў інтэлектуальных адносінах творы ўзніклі ў атмасферы найвастрэйшай сацыяльна-грамадскай і палітычнай барацьбы. З´яўленне твораў публіцыстычнага пісьменства ў старажытны перыяд вельмі часта наўпрост, непасрэдна залежала ад грамадскіх працэсаў. У якасці прычыны ці матыву да напісання публіцыстычнага твора выступала нязгода з публічна абвешчанымі поглядамі, вучэннямі, падыходамі, пазіцыяй. Часам стымулам выступала першая рэакцыя на падзею, ці наадварот, своеасаблівая форма «агітацыі» за яе, або «выкрыццё». Аўтары кіраваліся як уласнымі перакананнямі, гэтак і дактрынальнымі ўстаноўкамі канфесій і рэлігійна-культурных плыняў, да якіх яны належалі, што, аднак, не перашкаджала ім часам мяняць ідэйныя арыенціры на цалкам супрацьлеглыя.

Старабеларуская публіцыстыка – унікальная з´ява нацыянальнай інтэлектуальнай, духоўнай і мастацка-эстэтычнай культуры. Паводле колькасных і якасных параметраў – багацця жанраў, літаратурных формаў, ступені ўплыву на важныя сферы жыцця грамадства – яна належыць да асноватворных відаў старабеларускага пісьменства.

Беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы мелі на мэце пашырыць рэлігійна-філасофскія, сацыяльныя, эстэтычныя дактрыны, прыхільнікамі або стваральнікамі якіх яны з´яўляліся, сярод як мага шырэйшых колаў – розных станаў, людзей рознага сацыяльнага статуса, з розным адукацыйным узроўнем. Галоўную задачу яны бачылі ў фарміраванні пэўнага светапогляду ў грамадстве. Пісьменнікі-публіцысты скарыстоўвалі кожную нагоду і ўсялякую магчымасць, каб выкласці асноўныя палажэнні сваіх трактатаў – у часе дыспутаў у навучальных установах розных узроўняў, у літаратурных асяродках, на царкоўных саборах, падчас шляхецкіх соймікаў і на агульнадзяржаўных Вальных соймах.

Асаблівае месца ў публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў належала рэфармацыйным аўтарам. Лідары беларускай Рэфармацыі, вядомыя пісьменнікі-інтэлектуалы С. Будны, В. Цяпінскі, Я.Л. Намыслоўскі, Пётр з Гоняда, Павел з Бжэзін, Якуб з Калінаўкі, Павел з Візны, з´яўляліся арыгінальнымі мысліцелямі. Паводле ўзроўню ведаў ні ў чым не саступалі тагачасным еўрапейскім вучоным і багасловам. Пры вырашэнні кардынальных філасофскіх і рэлігійных

пытанняў яны ішлі ўласным шляхам, часам аспрэчваючы найважнейшыя палажэнні вучэнняў карыфеяў еўрапейскай Рэфармацыі – М. Лютэра і Ж. Кальвіна. Дыскусіі на багаслоўскія тэмы ў XVI стагоддзі нярэдка набывалі філасофскі характар, ператвараліся ў спрэчкі аб агульных заканамернасцях спасціжэння чалавекам акаляючага свету, спецыфіцы розуму і мыслення.

Канчатковай мэтай дзейнасці беларускіх пісьменнікаў-рэфарматараў з´яўлялася адмена існуючых царкоўных інстытутаў, стварэнне «рэлігіі духу», своеасаблівага варыянта свабоднай веры. Нягледзячы на пэўныя адрозненні паміж рознымі рэфармацыйнымі напрамкамі, амаль у кожным з іх было агульнае патрабаванне: ліквідаваць найважнейшыя знакі пакланення Богу – крыжы, хросны знак, літургіі, пасты, скітніцтва, скапецтва, абразы, асобныя тайны, малітвы (за выключэннем «Ойча наш», якая лічылася створанай самім Богам) і іншыя знешнія праявы рэлігійнага пачуцця.

Адметнай рысай ідэалогіі ўсяго заходнееўрапейскага, а таксама беларускага рэфармацыйнага руху з´яўлялася імкненне да шырокага асветніцтва і ўсеагульнай адукацыі. Беларускія гуманісты і рэфарматары, першымі абудзіўшы нацыянальныя пачуцці свайго народа, востра паставілі пытанне аб развіцці культуры на нацыянальнай мове *[4]*.

Уздым і росквіт мастацкай публіцыстыкі адбываўся ў перыяд, калі яшчэ адсутнічалі строгі падзел і дыферэнцыяцыя гуманітарных і прыродазнаўчых навук. Менавіта публіцыстычная літаратура Беларусі XVI–XVII стагоддзяў у значнай ступені ўзяла на сябе і дастаткова паспяхова выканала місію сінкрэтычнага мацерыка, прарадзімы сучаснай навукі – нацыянальнай філасофіі, літаратуразнаўства, мовазнаўства, этналогіі, культуралогіі, гісторыі, міфалогіі і тэалогіі. Апрача таго, многія праблемы, якія на сучасным этапе развіцця навукі датычацца выключна сферы дакладных навуковых дысцыплін, у старажытнай Беларусі развязваліся нярэдка на старонках публіцыстычных твораў.

## Ключавыя ідэі і праблемы

Беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы прапанавалі грамадству адказы на анталагічныя пытанні быцця, акрэслілі неабмежаваныя магчымасці чалавечага розуму ў спасціжэнні навакольнага свету, паставілі на парадак дня праблему эвалюцыі Зямлі і жыцця, сфармулявалі базавыя прынцыпы суадносін дзейнасці чалавека з законамі прыроды і космасу.

У публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў бараніліся асновы шляхецкай дэмакратыі, па тым часе передавой формы палітычнага ладу, адстойваліся прынцыпы прававой дзяржавы, прапаноўваліся найбольш эфектыўныя формы найвышэйшай улады ў краіне, распрацоўваліся мадэлі функцыянавання цэнтральных і рэгіянальных органаў выканаўчай улады. Найбольш значнае адкрыццё айчынных пісьменнікаў-інтэлектуалаў – ідэя грамадзянскіх свабод (палітычных і рэлігійных), прыярытэт правоў асобы.

Вельмі значны ўклад публіцыстаў XVI–XVII стагоддзяў у распрацоўку найскладанейшай праблемы сутнасці ўлады, яе прыроды, паходжання і прызначэння. Айчынныя мысліцелі пазітыўна-рэфарматарскай плыні аднадушна асуджалі тыранію і арыстакратыю, элементы якіх сустракаліся ў палітычнай практыцы Вялікага Княства Літоўскага. У творах А. Ротундуса, М. Літвіна, С. Буднага, А. Валяна, А. Філіповіча вельмі выразна сфармуляваны і вызначаны асноўныя функцыі манархаў як першых урадоўцаў, дакладна акрэслена кола іх абавязкаў. Сутнасць прапаноў пісьменнікаў-інтэлектуалаў зводзілася да трох палажэнняў: гаспадар заўсёды павінен ва ўсіх справах трымацца закону і справядлівасці, мецы асабістую схільнасць да навук, каб умела кіраваць дзяржавай і народам *[5]*.

Публіцысты таго часу асуджалі дэструктыўныя грамадскія з´явы, што падточвалі і разбуралі дзяржаўны арганізм. Перадусім яны выступалі супраць пашырэння шляхецкага анархізму, які праяўляўся ў «рокашах» (узброеных бунтах супраць караля) і няспынных патрабаваннях выключных правоў для сябе.

Менавіта ў публіцыстычнай літаратуры XVI–XVII стагоддзяў выкрываўся небяспечны для грамадства плебейскі анархізм, які набыў на беларускай зямлі даволі значныя памеры. Пачатковыя формы пратэсту людзей «подлага стану», незадаволенасць нізкім сацыяльным статусам у сярэдзіне XVI стагоддзя аформіліся ў шырокі грамадскі рух з пэўным ідэалагічным забеспячэннем. Аўтарамі дактрыны плебейскага анархізму з´яўляліся вядомыя пратэстанцкія лідары: Пётра з Гоняда, Аляксандр Вітрэлін, Якуб з Каліноўкі, Ян Немаеўскі, Павел з Візны, Марцін Чаховіц.

Ідэолагі анархізму, абапіраючыся на сапраўды гуманістычную ідэю адпрыроднай роўнасці людзей, заклікалі вярнуцца да раннехрысціянскіх ідэалаў, дзеля чаго прапаноўвалі ліквідаваць сацыяльную і маёмасную няроўнасць, падзяліць дабро багатых паміж беднымі, расфарміраваць усе дзяржаўныя інстытуты, урэшце, знішчыць органы ўлады, суд і войска.

Сістэму рацыяналістычных і схаластычных аргументаў анархістаў, іх асноўныя довады ў абарону ўтапічнага вучэння найбольш поўна прааналізаваў і аспрэчыў выдатны пісьменнік-публіцыст і мысліцель С. Будны ў трактатах «Вызнанне

аб урадзе і ўрадоўцах», «Абарона ўрада», «Апісанне Іўеўскага Сінода 1568 г.» і «Адказ на ліст Сеньёра». Яны ўвайшлі ў асобную кнігу асветніка «Аб свецкай уладзе» (Лоск, 1583).

Беларускія публіцысты, прадстаўнікі памяркоўнай плыні – М. Радзівіл Чорны, Я. Кішка, А. Валовіч, С. Будны, М. Кравіцкі, В. Цяпінскі, А. Валян, А. Ротундус, М. Літвін, Р. Хадкевіч, Л. Сапега – насуперак анархістам і іх далёкім ад жыцця ўтапічным мроям на старонках уласных публіцыстычных твораў прапанавалі грамадству аптымальную і жыццяздольную сацыяльную мадэль. Яны выпрацавалі ўзважаныя і эфектыўныя крокі ўдасканалення грамадскіх адносін, адстойвалі дзейсныя сродкі рэгулявання дзяржаўнага механізму, паклапаціўшыся пра юрыдычна-прававую аснову новаўвядзенняў. Слушнасць іх падыходаў і бачанне аддаленых перспектыў развіцця грамадства і дзяржавы пацвердзіў час.

У публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў дакладна фармуляваліся і даволі шырока абгрунтоўваліся шляхі стварэння прававой дзяржавы. Усебаковы аналіз рэчаіснасці, вывучэнне разнастайных чыннікаў грамадскага жыцця прывялі тагачасных пісьменнікаў-інтэлектуалаў да думкі пра першачарговую неабходнасць стварэння прававой дзяржавы. Жыццёвая неабходнасць замены недасканалага «звычаёвага права» на «пісаныя законы» пачала ўсведамляцца ўжо ў XV стагоддзі. Тады ж у Вялікім Княстве Літоўскім была зроблена першая спроба кадыфікацыі законаў, што адбілася ў славутым Судзебніку Казіміра 1468 года, які ўтрымліваў пераважна нормы крымінальнага права.

Вялікі гуманіст Ф. Скарына ў «прадмовах», «пасляслоўях» і «сказаннях» да біблейскіх кніг настойліва праводзіў думку пра неабходнасць рэгулявання законамі ўсіх сфер жыцця грамадства і краіны. Асаблівая роля, паводле яго слушнага меркавання, належала дзяржаўнаму, рыцарскаму, купецкаму, сямейнаму і крымінальнаму праву. Кожны закон, сцвярджаў беларускі асветнік, павінен адпавядаць традыцыям народа, быць справядлівым, грунтоўным, даступным, накіраваным на агульную карысць *[2, с. 173–176]*.

Паважлівае стаўленне Ф. Скарыны да пісанага права, выказаныя ім думкі пра ролю статутаў у жыцці грамадства даюць падставы гаварыць пра ўдзел гуманіста ў выпрацоўцы артыкулаў першага айчыннага збору законаў – Статута 1529 года. У грунтоўным зводзе законаў якраз падаваліся нормы дзяржаўнага, судова-працэсуальнага, сямейнага, вайсковага, апякунскага, зямельнага, ляснога і крымінальнага права.

Тэма прававой дзяржавы набыла асаблівае гучанне ў публіцыстыцы другой паловы XVI стагоддзя, у сувязі з пашырэннем анархісцкіх поглядаў. Абгрунтаванне ідэі прававой дзяржавы служыла своеасаблівым адказам анархістам. Ідэю прававой дзяржавы адстойваў у сваіх творах вядомы інтэлектуал А. Валян. «Там, дзе няма месца праву, – сцвярджаў ён, – там няма волі» *[6, с. 12]*. Абапіраючыся на Цыцэрона, Дэмасфена і Арыстоцеля, А. Валян даводзіў, што закон павінен мець непахісны аўтарытэт, карыстацца павагай у народа, адпавядаць здароваму сэнсу, «грунтавацца на адпрыроднай разважлівасці і добрым розуме», служыць «захаванню супольнага жыцця людзей» *[6, с. 18]*. Пісьменнік падкрэсліў пільную патрэбу ўдасканалення статутавых нормаў, прывядзення права ў адпаведнасць з патрабаваннямі жыцця. Пры гэтым А. Валян, як і Плутарх, на якога ён спасылаўся, зыходзіў з таго, што канчатковая мэта ўсялякага права – усталяванне справядлівасці.

Для пашырэння ключавых палажэнняў дактрыны прававой дзяржавы і развіцця тэорыі права ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI стагоддзя вельмі шмат зрабіў выдатны публіцыст, дзяржаўны і палітычны дзеяч Астафей Валовіч. Дзякуючы менавіта яго палемічна-публіцыстычным выступам на соймах і з´ездах, а таксама практычна-арганізацыйным намаганням быў распрацаваны і зацверджаны Статут 1566 года (уключаў 14 раздзелаў, 367 артыкулаў). У прывілеі Жыгімонта ІІ Аўгуста ад 1 сакавіка 1566 года, змешчаным у якасці прэамбулы да Статута 1566 года, зазначалася, што новы збор законаў з´яўляецца адзіным правамоцным дакументам, паводле якога будуць судзіць і ўсталёўваць справядлівасць для усіх грамадзян Вялікага Княства Літоўскага.

Ідэю прававой дзяржавы адстойваў Л. Сапега ў вядомай «Прадмове» да трэцяга Статута 1588 года *[7]*. Разважаючы пра сутнасць права, яго прызначэнне, ён услед за Арыстоцелем і Цыцэронам даказваў пільную патрэбу законаў для грамадства, іх незаменную ролю ў жыцці кожнай асобы. Л. Сапега пісаў: «Права з´яўляецца сапраўдным разважаннем і мудрым зрокам чалавечага розуму. Ім Пан Бог пажадаў адарыць чалавечую натуру дзеля таго, каб людзі маглі ўнікнуць ліхасці і трымацца прыстойнага жыцця» *[2, с. 297]*. Толькі тая дзяржава можа называцца справядлівай і свабоднай, дзе пануюць законы, а не воля манарха ці капрызы ўрадоўцаў, сцвярджаў Л. Сапега. Менавіта такі падыход, які гучаў з вуснаў пісьменнікаў-публіцыстаў і палітыкаў, спрыяў канчатковаму ўсталяванню ў старажытнай беларускай дзяржаве шляхецкай дэмакратыі, вядома, з усімі яе станоўчымі і адмоўнымі рысамі.

Тэарэтычныя распрацоўкі айчынных пісьменнікаў-інтэлектуалаў істотна паўплывалі на рэфармаванне палітычнай сістэмы гаспадарства, спрычыніліся да судова-адміністрацыйнай і зямельнай рэформаў 1560-х гадоў (А. Валовіч), вайсковых новаўвядзенняў (Р. Хадкевіч). Вельмі значнымі былі прапановы публіцыстаў, накіраваныя на ўдасканаленне



Публіцыстыка XVI–XVII стагоддзяў – унікальная з´ява нацыянальнай культуры

гарадскога самакіравання (Б. Граіцкі, М. Шчэрбіц, П. Раізій). Апрача таго, пісьменнікі паўплывалі на выпрацоўку знешнепалітычнай стратэгіі дзяржавы, карэкціроўку адносін з суседнімі краінамі. Яны ў сваіх творах прапагандавалі абарончую дактрыну княства (А. Валовіч, Р. Хадкевіч, Л. Сапега), баранілі дзяржаўны суверэнітэт і нязменнасць межаў краіны.

Прыхільнікі законнасці і панавання ў грамадстве права сфармулявалі і абгрунтавалі ў сваіх трактатах (С. Будны, А. Валовіч, Л. Сапега) вельмі важны для таго часу прававы прынцып адпаведнасці юрыдычных нормаў вучэнню Ісуса Хрыста і новазапаветнай хрысціянскай этыцы. Выказаныя імі ідэі мелі велізарнае ўздзеянне на юрыстаў-практыкаў і тых, хто выпрацоўваў канкрэтныя статутавыя артыкулы. Асаблівая роля належала выдатнаму публіцысту, дзяржаўнаму дзеячу, праўніку еўрапейскага ўзроўню Л. Сапегу *[8]*, які ў сваёй творчасці сінтэзаваў найгалоўнейшыя набыткі палітычна-прававой думкі XVI стагоддзя.

У публіцыстычных выступах і праектах аб´яднання Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства беларускія пісьменнікі-публіцысты заўсёды дамагаліся захавання ўсіх дзяржаўных устаноў: незалежнага вышэйшага заканадаўчага і распарадчага органа – Галоўнага з´езда (Вальнага сойма), сваёй дзяржаўнай Канцылярыі, цэнтральнай і мясцовай выканаўчай улады, а разам з імі пасад канцлера, падскарбія, гетманаў, ваяводаў і старастаў. Яны таксама настойвалі на неабходнасці асобнага войска, скарбу, манеты і адметнай фінансавай сістэмы. У праектах дзяржаўна-палітычнай уніі, якія прапаноўваліся і адстойваліся імі, асаблівае значэнне надавалася нязменнасці норм Статута 1566 года.

Вызначальнай рысай публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стагоддзяў стала патрыятычная тэматыка, змаганне з русіфікацыйнымі тэндэнцыямі і паланізацыйнымі праявамі, абарона этнічнай і духоўна-культурнай самабытнасці беларусаў. У старабеларускай публіцыстыцы ўпершыню адбыўся зрух у бок асэнсавання ўласнай самабытнасці, перадусім, усведамлення нацыянальнай літаратурнай мовы як важнага, надзвычай каштоўнага кампанента культуры, незаменнага фактару духоўнай эвалюцыі народа. Пісьменнікі-публіцысты абгрунтавалі ідэю выключнай ролі духоўнага лідара, асаблівае значэнне мастацкага слова і літаратуры ва ўдасканаленні грамадскіх стасункаў.

Такім чынам, беларускія інтэлектуалы прадставілі тагачаснай эліце глыбокія распрацоўкі маштабных грамадскіх пераўтварэнняў, напрамкі развіцця адукацыі і асветы, праграму рэформ дзяржаўных інстытутаў і ўдасканалення ўлады, судовых органаў, распрацавалі гуманістычныя прынцыпы адносін паміж сацыяльнымі станамі і канфесійнымі супольнасцямі, а таксама выпрацавалі нормы эфектыўных міжнародных і міждзяржаўных адносін.

Менавіта ў публіцыстыцы выкрышталізавалася ідэя пабудовы прававой краіны (А. Ротундус, А. Волан, Л. Сапега), неабходнасці панавання на ўсіх абшарах краіны пісанага права, адзінага закону. Беларускія пісьменнікі-публіцысты ў XVI–XVII стагоддзях абгрунтавалі ідэі свабоды слова і свабоды думкі, ідэйнай цярпімасці, сацыяльнага партнёрства, прапанавалі галоўныя прынцыпы грамадзянскай супольнасці, давялі да грамадскай свядомасці першаступенную важнасць, для «агульнага дабра», дасканалай судовай сістэмы, эфектыўных цэнтральнай і мясцовай улад, заявілі пра неабходнасць асветы і адукацыі «паспалітага люду», усебакова абгрунтавалі глыбока гуманістычны і дэмакратычны прынцып усеагульнай адукацыі, увядзенне ў навучальныя ўстановы цыкла з сямі асноўных навучальных дысцыплін – граматыкі, рыторыкі, дыялектыкі, арыфметыкі, геаметрыі, музыкі і астраноміі.

У спрэчках вакол пытання дзяржаўна-палітычных саюзаў Вялікага Княства Літоўскага з Польшчай і Маскоўскім княствам адназначна перамагла думка на карысць захавання дзяржаўнай цэласнасці краіны, якая, аднак, не заўсёды паслядоўна рэалізоўвалася ў палітычнай практыцы.

У выніку дыскусій паводле праблем міжканфесійных адносін сфарміравалася гістарычна перспектыўная дактрына рэлігійнай цярпімасці, мірнага суіснавання ў межах адной краіны адрозных канфесій, прычым з арыентацыяй на розныя духоўна-культурныя цэнтры: праваслаўя – на Канстанцінопаль, каталіцтва і ўніяцтва – на Рым.

Філалагічныя аспекты дыскусій публіцыстаў спарадзілі ідэю грамадскай патрэбы ва ўнармаванай літаратурнай мове, якая б засноўвалася на народнай моўнай традыцыі з яе марфалагічна-сінтаксічнымі адметнасцямі і лексіка-фразеалагічным багаццем.

Такім чынам, беларускія інтэлектуалы XVI–XVII стагоддзяў сінтэзавалі найважнейшыя аспекты ведаў тагачаснага чалавека, прапанавалі грамадству аптымальную мадэль развіцця. Тэарэтычныя напрацоўкі пісьменнікаў-публіцыстаў XVI–XVII стагоддзяў паслужылі трывалым падмуркам для стварэння неацэнных духоўна-культурных каштоўнасцей.

## Майстэрства палемікі і аргументацыі

Вызначальнай рысай творчага метаду пісьменнікаў-публіцыстаў з´яўлялася палемічнасць. Яна, як правіла, уключала чатыры кампаненты: раскрыццё тэзіса, або інтэрпрэтацыя пазіцыі апанента; аспрэчванне, адкідванне памылковага тэзіса, абвяржэнне; аргументаванне, або пазітыўны доказ; высновы, заключэнне.

Да асноўных тыпаў аргументаў, што ўжываліся ў старабеларускай публіцыстыцы, належалі: прававыя акты і юрыдычныя дакументы, свецкае і царкоўнае права; уласна лагічныя прыёмы: пытанні з адмоўем, reductio ab absurdum (давядзенне да абсурду); доказы, заснаваныя на прыродазнаўчых ведах, – «доказ па аналогіі»; схаластычныя аргументы (меркаванні і думкі аўтарытэтных асоб і сакральныя біблейныя тэксты); прыклады з гісторыі.

У дапамогу асноўным тыпам аргументацыі ўжываліся таксама «эмацыйныя» аргументы: указанне на бяздоказнасць сцвярджэнняў і некарэктнасць меркаванняў і высноў апанентаў; простае абвінавачанне супрацьлеглага боку ў хлусні ды няшчырасці; выкрыццё дробных хібаў і памылак апанента з высновай пра адсутнасць у яго глыбокіх ведаў, а то і наагул усялякіх здольнасцей; пацвельванне з апанента, сарказм, з´едлівыя кпіны ды ўзвальванне на яго тых жа «грахоў». Ролю аргументаў у публіцыстычных творах вельмі часта выконвалі (побач з уласна мастацкай функцыяй) устойлівыя выслоўі, прыказкі і прымаўкі.

Разгортванне сістэмы аргументаў, унутраная логіка доказаў вызначалася ў кожным канкрэтным выпадку характарам разглядаемай праблемы, а таксама суб´ектыўнымі фактарамі – палемічнымі і інтэлектуальнымі здольнасцямі аўтара. Колькасць аргументаў у палемічным блоку вагалася ад аднаго да некалькіх дзясяткаў, у залежнасці ад зместу тэзіса, яго актуальнасці і мэт пісьменніка-палеміста. Агульная лічба дыскусійных тэзісаў (папярэдніх і асноўных) у публіцыстычнай спадчыне набліжаецца, паводле зробленых падлікаў, да трох тысяч. Яны ахопліваюць актуальныя для таго часу сацыяльныя, грамадскія, царкоўна-гістарычныя, тэалагічныя, біблейна-экзэгетычныя, эстэтычна-мастацкія ды іншыя праблемы.

Праўдзівасць сілагізмаў (тэзісаў, прапазіцый) пісьменнікі-інтэлектуалы пацвярджалі рознымі відамі аргументаў, як таго і патрабавала вучэнне Арыстоцеля, аддаючы нярэдка перавагу сведчанням са Святога Пісання. Апошняя акалічнасць тлумачыцца тым, што ў XVI–XVII стагоддзях аргументы з Бібліі лічыліся бездакорнымі, максімальна аўтарытэтнымі. Таму галоўная задача хрысціянскіх пісьменнікаў-публіцыстаў, удзельнікаў палемікі вельмі часта зводзілася да таго, каб адшукаць у Святым Пісанні адпаведныя сведчанні, якія б пацвярджалі слушнасць кожнага з прапанаваных сілагізмаў.

Сістэму доказаў пісьменнікі-публіцысты будавалі пераважна на агульналагічным падмурку, ужываючы ўсе кампаненты і функцыянальныя элементы ўніверсальнай логікі, вядома, з яе адметным выяўленнем у сферы публіцыстыкі і пісьменства таго часу. Паэтыку публіцыстычных твораў наогул нельга аддзяліць ад логікі, яна надзвычай глыбока ўплецена ў іх, утвараючы адзін з галоўных унутраных стрыжняў.

Аргументацыя ў творах публіцыстыкі была больш змястоўнай, чым тая, якую прапаноўвалі тагачасныя падручнікі логікі. Практыка доказаў і аспрэчванняў апярэджвала тэорыю, пераўзыходзіла яе. Менавіта майстэрства палемікі стварала перадумовы для развіцця тэорыі, вызначала яе зместавыя параметры. Ва ўмовах тагачаснай Беларусі публіцыстыка фактычна замяніла логіку як найважнейшую гуманітарную дысцыпліну. Праз найбагацейшую практыку доказаў і аргументацыі, якія ўжываліся ў публіцыстычнай літаратуры, чалавек таго часу засвойваў прынцыпы строгай логікі разважання, адкрываў невядомыя метады дыскусіі, адточваў майстэрства дыскусіі, навучаўся эфектыўным прыёмам вядзення пераканаўчай палемікі.

У публіцыстычнай літаратуры выпрацоўваліся крытэрыі дакладнага, правільнага і адпаведна – памылковага, заганнага ў сферы маралі, рэлігіі і веры, права, эстэтыкі, гісторыі, што ў значнай ступені ўплывала на станаўленне, а затым і імклівую эвалюцыю асноватворных кампанентаў светапогляду чалавека эпохі Рэнесансу і барока.

Важным элементам мастацкай публіцыстыкі з´яўляліся азначэнні. Яны ўплывалі на станаўленне дыскурсіўнага тыпу мыслення, фарміравалі ўяўленні чалавека таго часу пра розныя бакі жыцця і з´явы акаляючага свету, выпрацоўвалі ўменне дакладна раскрываць, сцісла выкладаць сутнасць прадмета, у кароткім семантычным адрэзку перадаваць яго найважнейшыя рысы, прыроду, генезіс, змены ў часе, практычнае прымяненне і прызначэнне.

Паводле зробленых падлікаў, каля 900 тэрмінаў, прадметаў, з´яў з розных сфер навукі, грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця атрымалі азначэнні ў творах старабеларускай свецкай і рэлігійнай публіцыстыкі XVI–XVII стагоддзяў. Высокую частотнасць (ужыванне звыш дзесяці разоў) мелі наступныя: крыж, сакрамент, Бог, Тройца, Бог-Айцец, Бог-Сын (Ісус Хрыстос), Хрышчэнне, Прычашчэнне. Пісьменнікі-публіцысты спалучалі інтэнсіянальныя і экстэнсіянальныя азначэнні аднаго і таго ж паняцця, дасягаючы такім чынам максімальнай паўнаты яго раскрыцця і вытлумачэння.

Беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы, дэманструючы бліскучыя стылістычныя здольнасці, свабодна ўжывалі ключавыя фігуры літаратурнай мовы – антытэзы, паралелізм, фразеалагізмы і ўстойлівыя словазлучэнні, антыфразіс, гульню слоў, пералічэнні, аксюмаран, гратэск, анафары, рытарычныя пытанні, – якія надавалі іх творам асаблівы мастацкі каларыт, дасканаласць і выразнасць. Фігуры выкарыстоўваліся з разнастайнымі семантычнымі мэтамі: дзеля характарыстыкі міжцаркоўнай лучнасці, выкрыцця памылак у тэалагічных дактрынах, выразнага акрэслення мэт царкоўных сінодаў ды інш.

Беларускія пісьменнікі-публіцысты XVI–XVII стагоддзяў зрабілі надзвычай важнае мастацка-эстэтычнае адкрыццё, сутнасць якога ў тым, што ўвесь свет – гэта безліч знакаў, невычэрпная крыніца для сімвалатворчасці, утварэння шматлікіх тропаў. Пры гэтым яны выкарыстоўвалі ва ўласнай творчасці ўсе асноўныя вядомыя ў паэтыцы віды і тыпы тропаў – метафары, метанімію, параўнанні, эпітэты, сінекдаху, літоты, гіпербалы, перыфразіс, антанамасію, эўфімізмы, алегорыі. Дзякуючы віртуознаму валоданню ўсім багаццем тропаў, фігур, рытмікай, іншымі інструментамі літаратурнай тэхнікі беларускія творцы дасягнулі надзвычай высокага ўзроўню літаратурнага майстэрства.

Такім чынам, беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы таго часу заклалі трывалы падмурак нацыянальнай публіцыстыкі. Яны сфарміравалі стандарты, вызначылі ключавыя элементы публіцыстычнага дыскурсу і тэарэтычна абгрунтавалі ўнутраныя законы функцыянавання і логіку публіцыстычных твораў. Праз творы публіцыстычнай літаратуры адбывалася шматузроўневая камунікацыя, галоўны вынік якой – шчыльнае яднанне і глыбокая лучнасць грамадства. У гэтым сэнсе мастацкая публіцыстыка Беларусі XVI–XVII стагоддзяў адыгрывала ролю дзейснага фактара духоўнай, дзяржаўна-палітычнай і нацыянальнай кансалідацыі.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 04.05.2022 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Саверчанка, І. Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст. / І. Саверчанка. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 461 с.
2. Шэдэўры пісьменства і літаратуры Беларусі X–XVII стагоддзяў / укладанне, прадмова, каментарыі, пераклад І.В. Саверчанкі. – Мінск: Беларусь, 2016. – 566 с.
3. Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі: ад Францыска Скарыны да Сімяона Полацкага / С.А. Падокшын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 285 с.
4. Саверчанка, І. Магія слова: беларускія пісьменнікі XII–XVIII стагоддзяў: эсэ / І. Саверчанка. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2019. – 316 с.
5. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. / В.В. Дубровский, М.В. Кошуба, С.А. Подокшин и др. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 319 с.
6. Wolan, A. O wolności rzeczpospolitej, albo Szlacheckiej, książka godna ku czytaniu przedtem od niemałego czasu od pana Andrzeja Wolana sekretarza K. J. M. pisana, a dopiero nowo z łacińskiego języka na polski przełożona od Stanisława Dubingowicza (1601) / A. Wolan. – Biblioteka Polska. Serya na r. 1859, zeszyt 11, 12, 13. – Kraków, 1859.
7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.
8. Саверченко, И. Канцлер Лев Сапега / И. Саверченко. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2020. – 64 с.